

19 сакавіка,

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**

**Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.**



**Сёння барацьба ідзе ўжо не толькі за прыцягненне ў Беларусь студэнтаў-замежнікаў, але і за ўтрыманне на радзіме выпускнікоў беларускіх школ.**

СТАР. 6



**Пост нельга ўспрымаць як спосаб для пахудзення. Ён мае дачыненне найперш да духоўнага складніка — харчаванне з абмежаваннямі павінна спрыяць духоўнай рабоце над сабой.**

СТАР. 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 САКАВІКА 2012 г. ПЯТНІЦА № 50 (27165) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗЛІЧВАЕ НА ПАШЫРЭННЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ФАРМАЦЕ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў учора на сустрэчы з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам, перадае БЕЛТА.**

«Я вельмі рады, што нам давядзецца разам працаваць над удасканаленнем Саюзнай дзяржавы. Гэтым будзе займацца чалавек не толькі дасведчаны, але і які любіць Расію і Беларусь», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да Рыгора Рапоты.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, неабходна вызначыць падыходы, якія дапамогуць узняць узровень супрацоўніцтва ў гэтым саюзным праекце. «Мы знойдзем і, хутчэй за ўсё, абавязаны знайсці тыя напрамкі, якія дадуць магчымасць гаварыць аб добрай дынаміцы ў развіцці Саюзнай дзяржавы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама заўважыў, што Рыгор Рапота вельмі добра ведае выбранага Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. «Справа ў тым, што я з ім нядаўна размаўляў, і першая фраза, якую ён сказаў, была: «Нам трэба развіваць нашу інтэграцыю, быць бліжэй адзін да аднаго», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Сапраўды, час, сітуацыі, абставіны сведчаць менавіта аб гэтым і паказваюць, што нам не трэба глядзець па баках, што там па нас падумаюць. Трэба думаць аб сваім народзе і думаць аб тым, што гэты народ падумае пра нас у Расіі і Беларусі, і дзейнічаць у гэтым напрамку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Гатовы абмеркаваць сёння асноўныя напрамкі нашай дзейнасці аж да склікання Вышэйшага дзяржсавета і комплекс пытанняў, якія сёння востра стаяць у Саюзе Беларусі і Расіі», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Рыгор Рапота адзначыў, што для яго вельмі важна меркаванне Прэзідэнта Беларусі, каб правільна выбудоўваць работу выканаўчых органаў, паколькі ён таксама ўзначальвае Вышэйшы дзяржсавет. «Цалкам з вамі згодны, што мы павінны знайсці, і мы ўжо маем шэраг ідэй наконт гэтага аб развіцці супрацоўніцтва (у Саюзнай дзяржаве. — **Заўвага БЕЛТА**)», — сказаў дзяржсакратар.

Паводле яго слоў, цяпер вядзецца аналіз сітуацыі, звязанай з актывізацыяй работы ў тройцы АЭП. «Мы павінны разумець месца нашай Саюзнай дзяржавы ў гэтай інтэграцыйнай канструкцыі і ў цэлым у СНД», — сказаў Рыгор Рапота.

Акрамя таго, ён адзначыў, што таксама аналізуецца сітуацыя, звязаная з уваходжаннем Расіі ў СГА, каб для Саюзнай дзяржавы гэта было карысна. «Мы гатовы прапанаваць, і я хацеў бы з вамі сёння абмеркаваць і даведацца ваша меркаванне па пытанні пашырэння форм узаемадзеяння ў Саюзнай дзяржаве», — дадаў Рыгор Рапота.

## МОЛАДЗЬ ДАСТОЙНА ПРАДОЎЖЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА СУВЕРЭННАЙ БЕЛАРУСІ

**Моладзь дастойна прадоўжыць будаўніцтва суверэннай Беларусі, дзяржава ж па-ранейшаму будзе аказваць падтрымку маладым. Аб гэтым учора журналістам заявіў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў пасля цырымоніі ўручэння пашпартоў грамадзяніна Беларусі 16-гадовым школьнікам.**

У Дзень Канстытуцыі «Белая Русь» традыцыйна праводзіць акцыю «Мы — грамадзяне Беларусі», у час якой 16-гадовым юнакам і дзяўчатам, што найбольш вызначыліся ў вучобе, навуцы, грамадскай дзейнасці, ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюць пашпарты. Акрамя таго, у падарунак маладыя людзі атрымалі кнігу «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь» і сувеніры ад РГА «Белая Русь».

«У час такіх сустрэч разумееш: гэтым юнакам і дзяўчатам дадзена давяршыць і прымножыць тое, што старэйшае пакаленне зрабіць не змагло», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. Ён адзначыў, што ў Беларусі маладыя людзі маюць магчымасць атрымаць добрую адукацыю і карыстаюцца гэтым. Яны, напрыклад, актыўна вывучаюць замежныя мовы, якія, без сумнення, спатрэбяцца нават тым, хто выбера рабочую прафесію, таму што айчынныя прадпрыемствы адкрываюць за мяжой філіялы, сумесныя вытворчасці. Кваліфікаваныя рабочыя з веданнем замежных моў і сучасных тэхналогій патрэбны і ў Беларусі, якая актыўна мадэрнізуе вытворчасць.

Пасля ўручэння пашпартоў маладыя людзі мелі магчымасць абмеркаваць пытанні, якія іх цікавяць, з прадстаўнікамі ўлады і грамадскасці.

«Белая Русь» ужо трэці раз праводзіць акцыю «Мы — грамадзяне Беларусі». У гэтым годзе яна праходзіць у многіх рэгіёнах краіны.





# АСЦЯРОЖНА, ВЯСНА!



— Яшчэ ўчора мы хадзілі тут па тратуары, вады не было, — кажа жанчына, у роспачы гледзячы на непераадольныя паўтара-два метры вады паміж грунтовым насыпам і тоўстым пластом рачнога лёду. — Хто мог падумаць, што за ноч Свіслач выйдзе з берагоў?!

Сапраўды, учора ў сталічным мікрараёне Серабранка ад вясновай вады непераадольнаю аказалася пешаходная дарога, якая вядзе ў суседні Ленінскі раён. І звыклы маршрут многіх мінчан быў часова парушаным.

Вось і першая «ластаўка» вясны — паводка. Нават у мегаполісе невялікая рэчка можа парушыць звыклы лад жыцця. І нават спыніць. Але, як ні дзіўна, некаторыя пешаходы не любяць пасаваць перад перашкодамі на сваім шляху. Вось і ўчора каля Свіслачы назіралася карціна экстрэмальнага пераадолення нечаканай паводкі. Пераскочыць палонку спрабавалі не толькі мужчыны. Не адставалі і жанчыны. Праўда некаторым за гэтую спробу давялося заплаціць мокрымі чаравікамі і нават падзеннем у ваду. Бо тут не тое што на абцасах — у гумавых ботах хадзіць рызыкоўна.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## РЭКІ ВЫЙДУЦЬ «З СЯБЕ», АЛЕ НЯЗНАЧНА

**На большасці рэк краіны зараз назіраецца рост узроўню вады з сутачнай інтэнсіўнасцю ад 1 да 15 сантыметраў. На Ясельдзе каля вёскі Сенін, на Нёмане каля вёскі Беліца і на Пцічы каля вёскі Лучыцы вада ўжо выйшла на пойму. Неспрыяльныя ўмовы для працы рачнога транспарту назіраюцца на Дняпры каля Магілёва.**

Паводле інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра ўпраўлення і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС, вышыня снегавога покрыва на тэрыторыі краіны склала днямі ад 0 да 41 сантыметра, што на 1-13 сантыметраў вышэй нормы. Найменшыя яго значэнні — 1-4 сантыметры (або поўная адсутнасць) — адзначаюцца па захадзе краіны, найбольшыя — у паўночных і ўсходніх частках.

Воднасць Заходняй Дзвіны, Віліі, Бярэзіны і Дняпра (ніжэй Магілёва) аказалася ў норме, Сожа і Дняпра (вышэй Магілёва) — большай за звычайную на 20-50 працэнтаў, а меншай за норму на 20-50 працэнтаў — у басейнах Нёмана, Заходняга Буга і Прыпяці. У бліжэйшыя дні на рэках краіны будзе назірацца рост узроўню вады, на Случы каля вёскі Ленін, на Сожы каля Слаўгарада ўзровень перавысіць адзнаку выхаду вады на пойму.

Спецыялісты прагназуюць сёлета ўскрыццё рэк у другой палове сакавіка — пачатку красавіка. Максімальныя ўзроўні вады падчас веснавой паводкі прагназуюцца блізкімі да сярэдніх шматгадовых паказчыкаў. У перыяд развіцця веснавых працэсаў на большасці рэк вада выйдзе на пойму, аднак значнага іх разліву не чакаецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і сувязях з СНД:**

***«Вопыт Саюзнай дзяржавы ў адукацыйных працэсах, у галіне абароны неабходна перанесці на наступныя кааліцыйныя аб'яднанні. Мы гатовы падтрымліваць усе пачынанні ў развіцці інтэграцыйных працэсаў у рамках як Саюзнай дзяржавы, так і наступных кааліцыйных аб'яднанняў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.03.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8120,00 | ▼ |
| Еўра | 10610,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1012,78 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 9° |
| Віцебск | + 3° |
| Гомель | + 4° |
| Гродна | + 7° |
| Магілёў | + 2° |
| Мінск | + 6° |

■ АКТУАЛЬНА

# ЯКОЙ БУДЗЕ ЗАРПЛАТА?

**Зарплата — гэта цікава. Колькі атрымлівае мая калега? А галоўны рэдактар? Міністр? Яго сакратарка? Дырэктар крамы? Зарплата — гэта табу. Таму што пытацца пра яе непрыстойна: праславіцеся як дрэнна выхаваны чалавек. Да таго ж, па вялікім рахунку, больш за чужую зарплату нас цікавіць наша ўласная. З чаго яна складаецца і якія перспектывы чакаюць яе ў бліжэйшы час?**

Добрая навіна: дзяржава зацікаўлена ў тым, каб утрымаць высокакваліфікаваныя кадры, і не толькі рэальнага сектара эканомікі, але і бюджэтнай сферы. Таму робяцца новыя крокі па мадэрнізацыі аплаты нашай з вамі працы.

### Рэальны сектар не абавязаны прымяняць Адзіную тарыфную сетку

Летась былі кардынальна зменены падыходы да аплаты працы работнікаў рэальнага сектара эканомікі. У прыватнасці, істотна зніжана яе дзяржаўнае рэгуляванне ў камерцыйных арганізацыях усіх формаў уласнасці. З 1 чэрвеня 2011 г. яны маюць права самастойна фарміраваць умовы аплаты працы работнікаў, як з выкарыстоўваннем, так і без прымянення Адзінай тарыфнай сеткі, у тым ліку павышаць тарыфныя стаўкі (аклады) і прызначаць выплаты стымулюючага характару.

«Мы сёння далі магчымасць так працаваць рэальнаму сектару, — заявіла на калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі яго міністр Марыяна Шчоткіна. — З-пад прамога дзяржаўнага рэгулявання выведзена больш за 87 тысяч арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці. Але... на 1 студзеня 2012 года толькі 16,3% з 4,3 тысячы арганізацый камунальнай формы ўласнасці перайшлі на гібкія формы аплаты. Астатнія — інертныя. А людзям жа трэба даваць магчымасць зарабіць. Сёлета мы плануем правесці па ўсёй краіне семінары, якія абагульнілі б вопыт гэтых арганізацый».

### У бюджэтнай сферы ўзрасце дыферэнцыяцыя ў аплаце працы

Зарплата бюджэтнікаў рэгулюецца цэнтралізавана. У аснове яе ляжаць Адзіная тарыфная сетка і тарыфная стаўка першага разраду, якая вызначаецца ўрадам.

З 1 студзеня гэтага года тарыфная стаўка вызначана ў памеры 200 тыс. руб., зменены дыяпазон карэкціруючых каэфіцыентаў (з 2,862-0,915 на 3,720-0,920), што дазволіла адмяніць штомесячныя дыферэнцаваныя даплаты і індэксацыйныя выплаты (уведзеныя з 1 кастрычніка 2011 года).

У цэлым наша зарплата складаецца з дзвюх частак: абавязковай (асноўная або тарыфная заработная плата) і дадатковай або надтарыфнай (даплаты, надбаўкі, бонусы, прэміі). Ва ўрадзе ёсць планы па павышэнні тарыфнай стаўкі першага разраду. Пры гэтым ставіцца задача павелічэння дыферэнцыяцыі ўнутры Адзінай тарыфнай сеткі, каб можна было павялічваць зарплату ў залежнасці ад кваліфікацыі. Дзяржава на працягу шэрагу гадоў падтрымлівала нізкааплатных работнікаў, сацыяльна іх абараняла. Рабілася гэта з дапамогай карэкціруючых каэфіцыентаў. Але іх прымяненне сказіла дыферэнцыяцыю ў аплаце працы. У выніку розніца ў зарплаце, напрыклад, медсястры і санітаркі стала чыста сімвалічнай.

— *Якім чынам плануецца павялічыць дыферэнцыяцыю ўнутры Адзінай тарыфнай сеткі?* — пацікавіліся мы ў **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення працы і заработнай платы Мінпрацы і сацыяльнай абароны Беларусі Віктара СІДАРОВІЧА**.

— Зараз суадносіны ў аплаце працы работніка, тарыфікаванага 1-м і 27-м разрадамі, з улікам карэкціруючых каэфіцыентаў складаюць 2,1, у той час як па ўведзенай у 2001 годзе Адзінай тарыфнай сетцы яны складалі 7,84. Павелічэнне дыферэнцыяцыі ўнутры Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў будзе рабіцца, зыходзячы з фінансавых магчымасцяў дзяржавы, шляхам паэтапнай адмены карэкціруючых каэфіцыентаў.

СТАР. 2






## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАЛЯКІ ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРАЦЬ ПАВЕЛІЧЭННЯ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ



Некалькі тысяч палякаў 14 сакавіка выйшлі на акцыю пратэсту супраць намеру ўрада краіны павялічыць пенсійны ўзрост да 67 гадоў, паведамляюць інфармагенцтвы. Мітынг быў арганізаваны найбуйнейшай польскай апазіцыйнай партыяй «Закон і справядлівасць». Удзельнікі марша выказвалі незадаволенасць дзейнасцю ўрада Дональда Туска. Па словах прысутных, яны не хочуць працаваць да старасці, асабліва на цяжкай працы, якая патрабуе вялікіх фізічных высілкаў. Акрамя гэтага, ва ўмовах, калі ўзровень беспрацоўя ў краіне перавысіў 13%, многія непакояцца пра будучыню сваіх дзяцей, якія ўжо цяпер сутыкаюцца з вялікімі цяжкасцямі пры пошуку працы. У адпаведнасці з праектам урада Польшчы, кожныя чатыры месяцы пенсійны ўзрост у краіне будзе павялічвацца на 1 месяц. Такім чынам, мужчыны пачнуць сыходзіць на пенсію ў 67 гадоў у 2020 годзе, а жанчыны — у 2040-м.

### РЭЙТЫНГ САМЫХ ПРЭСТЫЖНЫХ ВНУ СВЕТУ

Брытанская газета The Times апублікавала рэйтынг 400 самых прэстыжных універсітэтаў свету. У першую пяцёрку ўвайшлі Каліфарнійскі тэхналагічны інстытут, Гарвардскі і Стэндфардскі ўніверсітэты (ЗША), Оксфардскі ўніверсітэт (Вялікабрытанія) і Прынстанскі ўніверсітэт (ЗША). З кожным годам сваё прадстаўніцтва ў рэйтынгу павялічваюць азіяцкія ВНУ. У гэты раз у яго трапілі 5 японскіх навучальных устаноў і дзве кітайскія.

### ЗАСНАВАЛЬНІК ПІРАМІДЫ «МММ» АРЫШТАВАНЫ

Стваральніку фінансавай пірамiды Сяргею Маўродзі прызначана пакаранне ў выглядзе арышту на 5 сутак. Як высветлілася, 56-гадовы «злы геній» паплаціўся за нявыплату адміністрацыйнага штрафу ў 1 тысячу рублёў. З 1994 па 1997 год праз створаную Сяргеем Маўродзі піраміду «МММ» прайшло да 15 млн падманутых пасля ўкладчыкаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СУПРАЦЬ ЭКАНАМІЧНАГА ЦІСКУ НА БЕЛАРУСЬ ВЫСТУПІЛІ ЛІТОЎСКІЯ ДЭПУТАТЫ



Пяць членаў камітэта па замежных справах парламента Літвы выступілі супраць эканамічных санкцый у дачыненні да Беларусі. У іх заяве сказана, што эканамічная ізаляцыя Беларусі падарве эканамічныя адносіны краіны з Літвой, а гэта пагоршыць фінансавы стан літоўскай дзяржавы і ўзмоцніць напружанне ў грамадстве.

«...Зараз чуюцца размовы аб прымяненні да Беларусі і эканамічных санкцый, — гаворыцца ў заяве. — На нашу думку, прымяненне такіх санкцый, у першую чаргу, закране эканоміку гэтай краіны і пагоршыць становішча звычайных грамадзян, якія і так жывуць у складаных умовах». Такое становішча, на думку аўтараў дакумента, «відавочна, супярэчыла б устаноўкам палітыкі Еўрасаюза аб пашырэнні магчымасці кантактаў радавых беларусаў з ЕС».

14 сакавіка ў камітэце па замежных справах прайшло галасаванне па гэтым дакуменце, але з-за адсутнасці кворуму заява не была прынята. Нагадаем, на днях супраць эканамічных санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі выступіла латвійскае партыйнае аб'яднанне «Усё для Латвіі!» — «Айчыне і свабодзе / ДННЛ».

КОРАТКА

У Беларусі рэальны памер пенсіі па ўзросце ў гэтым годзе, як плануецца, павялічыцца на 4,7-4,9 працэнта, паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса Яшкова. Найбольш высокія пенсіі атрымліваюць тыя, хто мае максімальныя паказчыкі стажу (45/40 гадоў для мужчын і жанчын) і мінулага заробку (індывідуальны каэфіцыент заробку 4,0 і вышэй).

У вёсцы Навасады Брэсцкага раёна гарэнне сухой травы на прысядзібным участку мясцовай пенсіянеркі да прыбыцця падраздзяленняў МНС ліквідавалі самі вяскоўцы. Адзін з іх, мужчына 1949 года нараджэння, пры гэтым моцна пацярпеў. Паводле яго слоў, віноўнікам здарэння быў менавіта ён сам: кінуў па неасцярожнасці ў сухую траву непатушаную запалку.

Распачата крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара чашніцкай фірмы, які ў выніку наўмыснага заніжэння падатковай базы ўхіліўся ад выплаты ў бюджэт падаткаў на суму больш за 60 мільёнаў рублёў. Аналагічным чынам дзейнічаў і кіраўнік аршанскай фірмы. Ён, пачынаючы з 2008-га і да 2011 года ўхіліўся ад выплаты падаткаў на суму больш за 40 мільёнаў рублёў.

## НАВОШТА ВАМ ДАЧА?



**Сяргей Макаранка, першы беларускі алімпійскі чэмпіён:**

— Для таго, каб дыхаць свежым паветрам. Праўда, дача ў мяне была даўно, зараз няма. У 1992 годзе я атрымаў 12 сотак непадалёк ад Мінска і вырашыў будаваць там дом. Нейкі час мне давялося папрацаваць за мяжой, зарабіў грошы, хоць на цяперашні час сума вельмі невялікая, але на тое, каб пачаць будаўніцтва, хапіла. Шмат чаго — кладку, бетанаванне, тынкоўку, драўляныя і рамонтныя работы — выканаў сваімі рукамі. Уласна кажучы, дом працягваецца будавацца і дагэтуль, хоць мы даўно ў яго пераехалі. Палову ўчастка займае сад і лёхі. Цяпер жа мы з жонкай пенсіянеры, свежую садавіну і гародніну пастаянна набываць на рынку дорага. Таму вырошчваем свае.



**Алена Спірыдовіч, тэлевядучая, заслужаная артыстка Беларусі:**

— Дача для мяне — гэта глыток свежага паветра. Я вельмі люблю ўстаць у 7 гадзін раніцы і паслухаць салаўёў і жабак — у мегаполісе людзі пазбаўлены такіх радасцяў. Так што я такая вось рамантычная дачніца. А папрацаваць? Што ў мяне добра на дачы атрымліваецца, дык гэта хутка накрываць сталы. І ўсе нашы сябры гэта ведаюць, таму гасцей у нас шмат заўсёды. А калі нікога няма, я люблю паваляцца з кніжкай у гамаку. Пасля рамонту ў кватэры я перавезла на дачу вялікую бібліятэку. Вось у гарадской мітусні ці даходзяць рукі да таго, каб пачытаць Лермантава? Зразумела, не. А на дачы — папросту. Таму з нецярпеннем чакаю надыходу дачнага сезона. А што датычыць кветак і гародніны, то вырошчваннем у нас цалкам займаюцца мае тата і муж. Ім гэта падабаецца і выдатна ў іх атрымліваецца.



**Марыя Карпенка, былы галоўны рэдактар, а цяпер член рэдкалегіі часопіса «Алеся», заслужаны работнік культуры Беларусі:**

— Заядлай дачніцай я стала толькі ў апошнія гады. Раней, разрываючыся паміж працай, грамадскай работай, домам і сям'ёй, лічыла дачу вялікай абузай, куды трэба ехаць у выхадныя і нешта там рабіць... Але жыццё — дзіўная рэч. Вось зараз многае, што спяшаўся зрабіць раней, здаецца такім нязначным, неабавязковым. З узростам разумееш, што за штодзённай мітуснёй губляецца нешта важнае, галоўнае. А менавіта ад гармоніі з ёй залежыць наша здароўе. Цяпер, наадварот, ляціш на дачу. Я ведаю, што многія любяць прыехаць туды, пасмажыць шашлычок, выпіць сто грамаў. Але гэта — не дача. Дача — гэта кавалак тваёй глебы, дзе ты нешта вырошчваеш, хоць бы і кветкі. Ведаеце, якая асалода: май, салаўіныя спевы, і ты бачыш, што з кінутага табой у глебу насення нешта вырастае! Вось летась у мяне атрымаўся выдатны ўраджай памідораў чэры. Нават мае блізкія сказалі: «Мама, на наступны год толькі гэтыя памідоры пасадзіш...».

**Падрыхтавала Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ТОРФОБРИКЕТНЫЙ ЗАВОД ДИТВА»

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Отчуждаемая часть здания торгового центра: изолированное нежилое помещение столовой (инв. № 420/D-117509), изолированное помещение торгового обслуживания (инв. № 420/D-117511). Отчуждаемая площадь здания 720,5 кв.м. Объем отчуждаемой площади 3014 куб.м. Фундамент здания – железобетонные блоки, стены и перегородки – кирпич. Перекрытия – железобетонные плиты. Кровля – совмещенная, рулонная. Полы – дощатые, бетонные, плитка. Оконные проемы – створчатые, окрашенные. Дверные проемы – филенчатые, пластиковые. Инженерные сети: водопровод – трубы металлические, канализация – трубы чугунные, теплоснабжение – трубы металлические, радиаторы чугунные, электроосвещение – электропроводка, телефон – калибровка, вентиляция – вентканалы. |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Лидский район, Дитвянский с/с, агрогородок Дитва, ул. Первомайская, д. 5, помещения 3,5. |
| Земельный участок | Кадастровый № 423683202625000023. Площадь земельного участка 0,3503. Назначение – для обслуживания здания торгового центра. |
| Начальная цена продажи | 813 965 900 (восемьсот тринадцать миллионов девятьсот шестьдесят пять тысяч девятьсот) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 40 698 295 (сорок миллионов шестьсот девяноста восемь тысяч двести девяноста пять) белорусских рублей |
| Продавец | Открытое акционерно общество «Торфобрикетный завод Дитва». 231322, Гродненская область, Лидский район, пос. Дитва, ул. Первомайская, 3, тел.: 8 0154 577 233, факс 8 0154 577705 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/сч для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 18 апреля 2012 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, Лидский район, Дитвянский с/с, агрогородок Дитва, ул. Первомайская, д. 5, пом. 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**
**Последний день приема заявлений – 17 апреля 2012 г. до 15.00**

**Телефон для справок:**
**41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

---

**30 марта 2012 года СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ (повторное)**

## ОАО «ЛУКОМЛЬЭНЕРГОМОНТАЖ»,

**расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8.**
**Собрание пройдет по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал.**

УНП 300007839

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности Общества на 2012 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2011 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытия убытков) за 2011 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2012 г. и первый квартал 2013 г.
7. О принятии решения о приобретении ОАО «ЛЭМ» его акций, отчуждаемых акционерами, в период по 31 августа 2012 г., определении цены приобретения акций, отнесении к компетенции Наблюдательного совета права определения цены приобретения указанных акций.
8. Об увеличении уставного фонда Общества.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 26 марта 2012 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

**Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 08.00 до 09.45.**

Время начала проведения собрания 10 часов 00 минут.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2012 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

**- акционеру Общества — паспорт; - представителю акционера — паспорт и доверенность.**

---

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ❖ Независимая строительная экспертиза

### Извещает о проведении закрытого аукциона 17 апреля 2012 г. по продаже права на заключение договора аренды торговых мест, принадлежащих ООО Торговый дом «Виктория»

| № лота | Наименование торгового объекта | Местоположение | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (без НДС ) | Сумма задатка, бел. руб. (без НДС) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Торговое место № 1 – торговый объект площадью 4,5 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 10 020 000 | 1 002 000 |
| 2 | Торговое место № 2 – торговый объект площадью 13,7 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 18 030 000 | 1 803 000 |
| 3 | Торговое место № 3 – торговый объект площадью 25,0 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 24 450 000 | 2 445 000 |
| 4 | Торговое место № 4 – торговый объект площадью 6,68 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 6 800 000 | 680 000 |
| 5 | Торговое место № 5 – торговый объект площадью 6,5 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 10 160 000 | 1 016 000 |
| 6 | Торговое место № 6 – торговый объект площадью 9,6 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 10 000 000 | 1 000 000 |
| 7 | Торговое место № 7 – торговый объект площадью 11,5 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 16 700 000 | 1 670 000 |
| 8 | Торговое место № 8 – торговый объект площадью 24,09 м² | Магазин «Верона», г. Гомель, ул. Советская, д. 21 | 34 050 000 | 3 405 000 |

**Цель использования объектов**: розничная торговля непродовольственными товарами.

**Ставка арендной платы *24500 бел. руб./м².***

**Срок аренды *3 месяца, начиная с 01 мая 2012 года.***

**Место проведения аукциона*: 17 апреля 2012 г. в 11.00 в ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46.***

Перечень документов для участия в торгах, согласно Законодательства Республики Беларусь, принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46.

Вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи оплачивает покупатель.

Шаг аукционных торгов 5%.

**Срок подачи документов**: до 16.04.12 г. до 17.00 включительно.

**Расчетный счет для перечисления задатка**: р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509.

**Дополнительную информацию можно получить по телефону**: (0232) 75 06 63.

---

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ❖ Независимая строительная экспертиза

### Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ЧТУП «Гомельская универсальная база», (0232)51 91 92

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта продажи | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | - Здание кирпичное, одноэтажное, специализированное складов торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 10000150 (составные части и принадлежности: пристройка, пешеходная часть, три забора, ворота) площадью 521,2 м.кв.; стоимостью 715 680 000 руб. с НДС;<br>- Здание кирпичное, одноэтажное, административно-хозяйственное, инв. № 10000125 (четыре кирпичных пристройки, две холодные кирпичные пристройки, крыльца) площадью 205,2 м.кв.; стоимостью 671 640 000 руб. с НДС;<br>- Котел КСТГ-20, инв. № 0000135 стоимостью 3 498 000 руб. с НДС;<br>- Здание кирпичное, одноэтажное, специализированное складов торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 10000128 площадью 142,3 м.кв.; стоимостью 208 080 000 руб. с НДС;<br>- Здание кирпичное, одноэтажное, административно-хозяйственное, инв. № 10000130 (шесть пристроек, гараж, сторожка) площадью 181,7 м.кв.; стоимостью 579 000 000 руб. с НДС; площадь земельного участка – 0,3685 га.<br>Возможно расширение улиц Урицкая и Щедрина | г. Гомель, ул. Лещинская, 2а | 2 177 898 000 | 217 789 800 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **До 17.00 17 апреля 2012 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 |
| Дата, время, место, проведения аукциона | **18 апреля 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность |
| Условия продажи | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс).**

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**

## Открытое акционерное общество «МОГИЛЕВСКИЙ ЗАВОД ИСКУССТВЕННОГО ВОЛОКНА» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМОГО ИМУЩЕСТВА.

**Аукцион состоится 17 апреля 2012 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.**

Собственник, продавец и организатор аукциона:
ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.
Контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

| № лота | Наименование | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. | В т.ч. сумма НДС 20%, руб. | Сумма задатка с НДС, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автопогрузчик ДВ-1661 | 2000 | **9 100 000** | 1 516 667 | 910 000 |
| 2 | Электропогрузчик ЕВ-687.33 | 1998 | **14 400 000** | 2 400 000 | 1 440 000 |
| 3 | Электропогрузчик ЕВ-687.33 | 1998 | **14 400 000** | 2 400 000 | 1 440 000 |
| 4 | Трактор Т-150К 165 л.с. 15-13 IТ | 1989 | **29 100 000** | 4 850 000 | 2 910 000 |
| 5 | Автомобиль УАЗ-3741 (специальная) 19-80 ТИ | 1991 | **6 300 000** | 1 050 000 | 630 000 |
| 6 | Трактор МТЗ-82,6 15-15 IТ | 1993 | **25 000 000** | 4 166 667 | 2 500 000 |
| 7 | Смеситель ЗШ1000В | 1992 | **210 000 000** | 35 000 000 | 21 000 000 |
| 8 | Смеситель ЗШ-1000 | 1992 | **210 000 000** | 35 000 000 | 21 000 000 |
| 9 | Весы торцевые РП-150 | 1992 | **554 400** | 92 400 | 55 440 |

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются **не позднее 16 апреля 2012 года** на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491088 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк», код 226, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

**Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.**

Последний день подачи заявок: **16 апреля 2012 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона состоится **17 апреля 2012 года с 11.30 до 12.00** в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней после проведения торгов возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением документации, необходимой для его проведения. Демонтаж оборудования проводится за счет покупателя и в стоимость объектов не включается.

---

Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности перевозчика перед пассажирами серии ОП № 090210 **считать недействительным.** УНП 101883943.

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

## Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта **«Строительство двух многоэтажных жилых домов типовых потребительских качеств в микрорайоне Сухарево-6 (в квартале ул. Академика Федорова — ул. Панченко — ул. Сухаревской). Жилой дом № 1 по генплану», опубликованную в газете «Звязда» № 192 от 7 октября 2011 года:**

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах на 01.03.2012 составляет 7 621 452 рубля для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

*Генеральный директор*
*Н.В. Милошевский*

---

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
### о проведении открытой продажи второго выпуска жилищных облигаций закрытого акционерного общества «Топзапэлектро»

**1. Полное и сокращенное наименование Эмитента (на белорусском и русском языках)**

на белорусском языке:
полное: Закрытае акцыянернае таварыства «Топзапэлектра»;
сокращенное: ЗАТ «Топзапэлектра»;
на русском языке:
полное: Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро»;
сокращенное: ЗАО «Топзапэлектро».

**2. Номера расчетного счета эмитента на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка**

Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций первого выпуска эмитента (далее по тексту – облигации) будут поступать на расчетный счет эмитента № 3012004261000 в ЗАО «Сомбелбанк», код 755 (г. Минск, ул. К. Маркса, 25, УНП 807000122).

**3. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарий эмитента – Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк» (ЗАО «МТБанк»), код депозитария 014, расположен по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, Партизанский пр-т, 6А, комн. 703.

**4. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С более подробной информацией и проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения по адресу: в офисе ЗАО «Топзапэлектро» по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 8н. Режим работы: пн.–четв. 9.00–13.00, 14.00–18.00; пятница 9.00–13.00, 14.00–16.00.

**5. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, серия, номера:**

| | |
|---|---|
| Форма выпуска и вид облигаций | Жилищные, бездокументарные, именные, неконвертируемые |
| Объем эмиссии | 10 200 000 000 (Десять миллиардов двести миллионов) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 1 700 (Одна тысяча семьсот) штук |
| Серия, номера облигаций | ТЗЭ-2, №№ 000001-001700 |

**6. Номинальная стоимость облигаций**

Номинальная стоимость одной облигации составляет 6 000 000 (Шесть миллионов) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения в строящемся жилом доме № 25 (по генплану) по ул. Водолажского в микрорайоне № 1 пос. Восточный (далее – объект).

**7. Период проведения открытой продажи облигаций**

Дата начала открытой продажи облигаций: 15 марта 2012 года.

Дата окончания открытой продажи облигаций: дата продажи последней облигации, но не позднее 31 декабря 2012 года.

**8. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций: с 15 марта 2012 года по 31 декабря 2012 года включительно (320 календарных дней).

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С более подробной информацией и проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения по адресу: в офисе ЗАО «Топзапэлектро» по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 8н. Режим работы: пн.–четв. 9.00–13.00, 14.00–18.00; пятница 9.00–13.00, 14.00–16.00, тел.: 2531615, 2908954, 2550005

---

**Уважаемые акционеры ОАО «Институт «Минскгражданпроект»**
**29 марта 2012 года в 15.00**
**состоится очередное общее собрание акционеров**

## ОАО «Институт «Минскгражданпроект»

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Гебелева, 5, актовый зал профессионально-технического колледжа им. В.Г. Каменского.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году.
2. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности Общества на 2012 год.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса Общества.
5. О распределении прибыли и выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2012 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

Регистрация участников собрания с 14.30 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру Общества – паспорт,
представителю акционера –
паспорт и зарегистрированную доверенность.

*Наблюдательный совет*
*ОАО «Институт «Минскгражданпроект»*

УНП 600013280.

---

## Общество с ограниченной ответственностью «АЛЬФА-БРОКЕР»

*220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, тел. 266 24 17*

### ГОДОВОЙ БАЛАНС за 2011 год

млн руб.

| АКТИВ | Код строки | На начало отчетного года | На конец отчетного года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 110 | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 12 | 55 |
| амортизация | 102 | 3 | 18 |
| остаточная стоимость | 110 | 9 | 37 |
| Нематериальные активы | 120 | | |
| Запасы и затраты | 210 | 17 | 18 |
| Дебиторская задолжность | 240 | 18 | 57 |
| Денежные средства | 260 | 14 | 76 |
| Финансовые вложения | 270 | | |
| **БАЛАНС** | **300** | **58** | **188** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало отчетного года | На конец отчетного года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Уставный фонд | 410 | 3 | 3 |
| Добавочный фонд | 430 | 11 | 25 |
| Нераспределенная прибыль | 450 | 18 | 121 |
| Краткосрочные займы и кредиты | 510 | | |
| Кредиторская задолжность | 620 | 26 | 39 |
| **БАЛАНС** | **700** | **58** | **188** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2011 год

млн руб.

| Наименование показателя | Код строки | 2011 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 671 | 325 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | - | 54 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 671 | 271 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 408 | 263 |
| Валовая прибыль | 040 | 263 | 8 |
| Прибыль от реализации | 070 | 263 | 8 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 2 | 9 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | - | 1 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 090 | 2 | 8 |
| доходы от операций с активами | 093 | - | 8 |
| Операционные расходы | 100 | - | 8 |
| расходы от операций с активами | 102 | - | 8 |
| Прибыль от операционных доходов и расходов | 120 | 2 | - |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 10 | |
| Внереализационные доходы за вычетом налогов и сборов | 140 | 10 | |
| Внереализационные расходы | 150 | 24 | 3 |
| в том числе: курсовые и суммовые разницы | 152 | | |
| прочие внереализационные расходы | 154 | | |
| Убыток от внереализационных доходов и расходов | 160 | -14 | -3 |
| ИТОГО прибыль за отчетный период | 200 | 251 | 5 |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 9 | 3 |
| Прибыль до налогообложения | 240 | 260 | 8 |
| Налог на прибыль | 250 | - | 2 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 55 | - |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 75 | 3 |
| Чистая прибыль (Убыток) | 300 | 121 | 0 |

В 2011 году компания сотрудничала с аудитором индивидуальным предпринимателем Исакович Ириной Семеновной. Юридический адрес: 220117, г. Минск, пр. Любимова, д. 33, кв. 148, УНП 190524134 от 18.03.2004 г. Свидетельство о государственной регистрации от 18.03.2004 г. № 190524134 выдано Минским горисполкомом.

Аудиторское заключение: бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО «Альфа-Брокер», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Альфа-Брокер» на 1 января 2012 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2011 год, при этом совершенные ООО «Альфа-Брокер» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству. УНП 806000258.

---

## Открытое акционерное общество «ХОРОШЕЕ НАСТРОЕНИЕ»

УНП 100097687

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2011 г.

млн руб.

| АКТИВ | На конец отчетного года в млн руб. | ПАССИВ | На конец отчетного года в млн руб. |
|---|---|---|---|
| Основные средства: | | Уставный фонд | 83 |
| первоначальная стоимость | 8399 | Добавочный фонд | 5222 |
| амортизация | 3442 | Непокрытый убыток | -177 |
| остаточная стоимость | 4957 | Доходы будущих периодов | - |
| Нематериальные активы: | - | Прибыль (убыток) отчетного года | 127 |
| первоначальная стоимость | 1 | Краткосрочные кредиты и займы | - |
| амортизация | 1 | Кредиторская задолженность | 163 |
| остаточная стоимость | - | | |
| Вложения во внеоборотные активы | - | | |
| Запасы и затраты | 43 | | |
| Налоги по приобрет. ценност. | - | | |
| Дебиторская задолженность | 412 | | |
| Денежные средства | 6 | | |
| **БАЛАНС** | **5418** | | **5418** |

## Открытое акционерное общество «ХОРОШЕЕ НАСТРОЕНИЕ»

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2011 г. по 31 декабря 2011 г.

млн руб.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 1121 | 931 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 0 | 149 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 1121 | 782 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 122 | 60 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 999 | 722 |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | 762 | 627 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 237 | 95 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 2 | |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | | |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 2 | 0 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | | |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | |
| доходы от операций с активом | 093 | | |
| прочие операционные доходы | 099 | | |
| Операционные расходы | 100 | 3 | |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | | |
| расходы от операций с активами | 102 | | |
| прочие операционные расходы | 109 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | -1 | 0 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 1 | |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | | |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 1 | 0 |
| Внереализационные расходы | 150 | 20 | 8 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -19 | -8 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | 217 | 87 |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | | |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+/-210+/-220) | 240 | 217 | 87 |
| Налог на прибыль | 250 | 0 | 14 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 90 | 35 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 0 | 1 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | 127 | 37 |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | | |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | | |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | | |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | | |

**Руководитель** **Бернада Е.А.**
**Главный бухгалтер** **Страузова Н.В.**

■ Здаровае харчаванне

# ПОСНЫ СТОЛ



**З пачаткам чарговага посту многія адчуваюць жаданне падтрымаць яго. Але самае важнае тут — разумець, што пост мае дачыненне найперш да духоўнага складніка. Харчаванне з пэўнымі абмежаваннямі павінна спрыяць духоўнай рабоце над сабой, а не, скажам, прывядзенню фігуры ў парадак.**

Пасціцца — не значыць сядзець на дыеце, кажа **малодшы навуковы супрацоўнік аддзела гігіены харчавання РНПЦ гігіены Вольга ЛІХОШВА**. Пост нельга ўспрымаць як дыету, спосаб для пахудзення. Часовая адмова ад мяса, рыбы, яек, малочных прадуктаў не прынясе шкоды здароваму даросламу арганізму. Добра і карысна прыгадаць у гэтыя дні пра звычайны недахоп у рацыёне садавіны, пра гародніну, якую варта гатаваць на пары, варыць або запякаць. Больш актыўна трэба ўводзіць у рацыён бабовыя і крупы, посны хлеб, які не змяшчае маргарын і яйкі, хлябцы з цэльнага зерня.

— Я не трымаюся посту ў сэнсе ежы, — кажа **тэлевядучая Алена СПІРЫДОВІЧ**. — Па той простай прычыне, што пры маёй інтэнсіўнасці жыцця я вельмі баюся аслабнуць. Трэба бегчы, бегчы, бегчы і шмат працаваць... Мы з мужам амаль не ядзім мяса, бо проста не любім тлустую ежу. Вось ужо шмат гадоў як мы не набываем і ніякіх каўбасных вырабаў. Няма на нашым стале нічога смажанага — толькі тушанае. У халадзільніку — пераважна садавіна і гародніна. Пара качаноў капусты, морква, буракі, гуркі, памідоры, цыбуля — гэта ёсць заўсёды. З садавіны люблю мандарыны, яблыкі — магу кілаграм яблыкаў за дзень з'есці. Люблю і арэхі з сухафруктамі. Вось на сняданак мы з мужам звычайна ўжываем аўсяную кашу з бананам, разынкамі і дзёртай морквай. Замест разынак могуць быць курага або чарнасліў. А дзёртая морква застаецца ад свежаадціснутага соку...

Алена Спірыдовіч ніколі не сядзела на дыетах. Проста яна ўжо доўгі час прытрымліваецца здаровага ладу жыцця, а здаровае харчаванне — неад'емная яго частка. Што да посту, то ў гэты час Алена лічыць неабходным адмовіцца ад усяго непатрэбнага, знайсці момант для развaг пра нешта сапраўды важнае.

А вось **генеральны дырэктар ТАА «Караван XXI стагоддзе» Сяргей БАРЫСЕНКА** посту прытрымліваецца. І тым жа крокам, мяркуе, пойдуць яго дзеці, калі дасягнуць 7-гадовага ўзросту. Сняданак у сям'і Барысенкаў — розныя кашы з сухафруктамі і арэхамі. Сяргей перакананы, што арэхі штодня павінны быць на стале кожнага беларуса, паколькі тое, што расце пад сонцам, назапашвае жыццёва неабходныя вітаміны з мікраэлементамі, многіх з якіх не хапае фактычна кожнаму з нас. Узяць хоць бы бразільскі арэх. У ім шмат селену, якога нестае любому, хто пражывае ўдалечыні ад мора і рэдка дазваляе сабе морапрадукты. Шмат вітаміну Е і ёду ў грэцкім арэху, а калію і кальцыю — у міндалі. Карысныя, безумоўна, і іншыя арэхі — у тым ліку арахіс, які будзе дарэчы хворым пасля цяжкіх аперацый. Аднак паколькі арэхі надта багатыя на тлушчы, няхай нават карысныя, поліненасычаныя, то з'яўляюцца высокакаларыйнай ежай, якую неабходна жорстка абмяжоўваць. У дзень даросламу чалавеку дастаткова ўжыць два бразільскія арэшкі, кедру — 50 г.

Што да сухафруктаў, то ўсе яны змяшчаюць кансерванты, паколькі ў іншым выпадку не захаваюцца. Пры пакупцы арэхаў і сухафруктаў трэба кіравацца простым правілам — не набываць іх на стыхійных рынках. У фірменных пунктах гіпермаркетаў пакупніку гарантуецца, што тавар будзе мець належны тэрмін прыдатнасці і што ён будзе ад вытворцаў, якія належным чынам тавар мыюць, захоўваюць, фасуюць, аб чым дакументальна гавораць пасведчанні якасці.

*Курага вяленая або сушаная? Не вядзіцеся на такія «тлумачэнні» прадаўцоў. Спосаб нарыхтоўкі курагі адзін (з той толькі розніцай, што ў Турцыі курагу вырабляюць прамысловым спосабам, а ў Таджыкістане — традыцыйным, сушаць на сонцы). Іншая справа — у гатовым прадукце можа заставацца розная колькасць вільгаці. Гэта дапускаецца.*

*Арэхі смажаныя або сырыя? Зразумела, першыя больш смачныя, але менш карысныя, паколькі падчас награвання разбураюцца вітаміны. Набываць варта не смажаныя арэхі, якія пасля падсушваць у духоўцы.*

*Як захоўваць арэхі, сухафрукты, цукаты? У сухіх месцах без рэзкіх пахаў (падалей ад спецый, кавы і г.д.). У папяровых пакетах, палатнянай, шкляной, керамічнай тары — не ў поліэтыленавых пакетах. У летні час курагу, інжыр, чарнасліў, разынкі, фінікі, кампотную сумесь варта захоўваць у халадзільніку.*

*Ці трэба мыць сухафрукты? Абавязкова. Не толькі мыць, але і замочваць (курагу, чарнасліў) у цёплай вадзе на 10-15 хвілін.*

Шэраг аб'ектаў грамадскага харчавання распрацоўваюць поснае меню. **Загадчыца вытворчасці страўні «Камяніца» Алеся СТРУНЕЎСКАЯ** — сібірачка, вырасла, што называецца, на сапраўдных пельменях ды піражках з рознымі начынкамі. А таму свайго жыцця без мяса не ўяўляе. Тым не менш, народныя традыцыі поснага харчавання добра ведае. З напояў і ў Беларусі, і на Русі папулярнасцю карысталіся збітні (з мёду ды ягад), кампоты, морсы, адвары мацярдушкі, іван-чаю, мяты і іншых траў. Самае простае з другіх страў — бульбяныя аладкі. Цёртая бульба, цыбуля ды мука. Паколькі няма яек, то мукі трэба дадаваць шчодра. Гэткім жа чынам гатуюцца і дранікі з гарбуза. Цёрты гарбуз плюс пабольш мукі. Посныя галубцы — гэта рыс з гароднінай. Любы суп з гародніны — зноў жа, посны. Каша, куцця гатавалася з любых круп.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# Насланнё... Павел Шапо



**На працягу месяца наведвальнікі аўтацэнтра «Атлант-М Уручча» маглі не толькі прыглядзецъ ці набыць новенькае аўто, а яшчэ і далучыцца да сучаснага мастацтва. Ёсць час гэта зрабіць і зараз. Тым больш, што далёка ісці не трэба. «Mexico obsesion», ці «Мексіканскае насланне», — так называецца выстава беларускага мастака Паўла Шапо, якая ўпрыгожвае інтэр'ер аўтацэнтра.**

Гэта не першы сумесны праект аўтара з аўтасалонам. І справа не ў тым, што не любіць мастак карцінныя галерэі. Проста іх у Мінску няшмат, ды і трапіць туды складана.

— Падача мастацтва можа быць рознай, — думае Павел Шапо. — Чаму б, напрыклад, у кавярні не зрабіць выставу? У Мексіцы гэтая практыка стала ўжо арганічным пластом культуры. Людзі прыходзяць не толькі, каб паесці ці абмеркаваць штосьці. Яны могуць гадзінамі там сядзець і захапляцца пэўнымі палотнамі. Падобныя «галерэі» можна арганізаваць у любым месцы, і аўтасалоны — не выключэнне. Я лічу, што гэта добры і ўніверсальны спосаб далучыцца да мастацтва, бо ў сучасных людзей няма часу асобна хадзіць у крамы, рэстараны, музеі.

На выстаўцы 10 работ мастака. І ўсе яны прысвечаны Мексіцы — мары, якую Павел ажыццявіў летась. Уражанні і эмоцыі ад паездкі дзякуючы каханай знайшлі ўвасабленне на палотнах. Дзяўчына так хацела даведацца пра гэтую краіну, што адных аповедаў ёй было мала.

Водар толькі што зваранай кавы, цёплы дождж, пах кветак, прыемная музыка, смак тэкілы і лімонаў... Сапраўды «насланне». Колераў, пачуццяў, эмоцый... І яно бясконцае, бо аўтар вельмі любіць падарожнічаць. І як вынік — уражанні ад той ці іншай краіны знаходзяць сваё ўвасабленне на палотнах. Зараз мастак працуе над аналагічнай экспазіцыяй, прысвечанай Індыі, па якой ён не так даўно падарожнічаў. А ў планах — Амерыка, В'етнам, Новая Зеландыя...

Не здарма гавораць: калі чалавек таленавіты, ён таленавіты ва ўсім. Вось ужо на працягу пяці гадоў Павел працуе на «Беларусьфільме» мастаком-пастаноўшчыкам. Прафесія звыклая, толькі «маляваць» трэба ў падсвядомасці. Пры яго ўдзеле выйшла ўжо 7 кінафільмаў. Зараз працуе над сумесным праектам Беларусі і Расіі рэжысёра Івана Паўлава «Мамачкі!».

— Праца мастака-пастаноўшчыка малапрыкметная, — расказвае Павел. — Аднак не ўсе ведаюць, што адсутнасць кіналяпаў — гэта яго заслуга. Усе толькі прывыклі думаць, што калі добры фільм — гэта рэжысёрскі поспех, калі дрэнны — мастак-пастаноўшчык недапрацаваў.

А Павел Шапо — аптыміст: верыць, што калі-небудзь праца кожнага будзе заўважана. І рэаліст: разумее, што здымаць кіно — занятак непастаянны. А чакаць каля мора пагоды мастак не прывык. Таму заўсёды нечым займаецца. Напрыклад, працуе ў якасці дэкаратара і дызайнера інтэр'ераў. Дзякуючы яго фантазіі і здольнасцям сучасны і прыгожы выгляд набылі некалькі клубаў, прыватныя кватэры і дамы, а таксама офісы некаторых арганізацый.

У вольны час Павел піша п'есы і складае вершы. Восенню ўбачыць свет альбом групы «У.Б.», арганізатарам і ўдзельнікам якой ён з'яўляецца. І на гэтым спыняцца не збіраецца. У планах — паставіць спектакль па сваёй п'есе, зняць кінафільм у якасці рэжысёра, выпусціць адзенне пад сваім брэндам.

— Чалавек мастацтва павінен быць медыя, — тлумачыць сваю рознабаковую дзейнасць Павел. — І я не баюся пагнацца за двума, а то і больш, «зайцамі». Усё атрымаецца, калі прыкласці максімум намаганняў і цярпення.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара і з архіва Паўла ШАПО.**



У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ



**Не прафесія, а «дыягназ». Менавіта так гавораць пра сябе супрацоўнікі «хуткай дапамогі». Карэспандэнт «Звязды» падзяжурыў з брыгадай Мінскай гарадской станцыі хуткай дапамогі і пачуў некалькі жыццёвых гісторый.**



**— Я не вельмі разумею, што такое звышзадача для пісьменніка. Задача — з гэтым больш-менш ясна. Ды і то яна часцей за ўсё канчаткова праясняецца ў працэсе работы, — гаворыць празаік, перакладчык Алег Ждан.**

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
№ 3 (425)

## НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

**16 сакавіка.** Робяць закладку клубняў бульбы на прарошчванне. Селянін абыходзіў поле крыж-накрыж.

**17 сакавіка.** Герасім Грачэўнік. У гэты дзень прылятаюць з выраю гракі. Калі гракі прылятаюць адразу на гняздо, то лічыцца, што вясна будзе дружная.

**18 сакавіка.** Конан Агароднік. Дзень агароднікаў. Калі на Конана цеплыня, ясна — граду ўлетку не будзе. Лічылі, што калі ў гэты дзень пачынаць «араць агарод» (хоць бы зрабіць некалькі лунак або капкоў рыдлёўкай), то агарод будзе добры і гародніны будзе шмат. У гэты дзень замочвалі насенне для пасеву, правілі вілы, рыдлёўкі, граблі. У гэты ж дзень трэба было рыхтаваць парнікі, а ў мэтах змагання з агароднымі шкоднікамі і засухай выкапаць на агародзе тры лункі, прыгаворваючы: «Адна лунка для сушы, другая для мошкі, трэцяя для чарвякоў».

**19 сакавіка.** Калі ў гэты дзень мароз, то будзе яшчэ сорак ранішніх замаразкаў. Пачынаюць ажываць мухі, матылі лімонніцы.

**20 сакавіка.** Дзень Васіля Капельніка. «З Васіля вясна ідзе».

**21 сакавіка.** Дзень вясновага раўнадзенства (22-га — у высакосны год). Дзень з ноччу раўняецца. Астранамічны дзень нараджэння вясны. Пачатак руху сокаў у клёна. Серабрыцца вярба.

**22 сакавіка.** Саракі. Сяляне звязвалі дзень сарака пакутнікаў з абуджэннем прыроды ад зімовага сну. Лічылася, што ў гэты дзень прыходзіць цеплыня.

# ПАЛЯВАННЕ НА ПАМЫЛКІ

## пачалі вучні гомельскай гімназіі № 51

**«Пайшла аднойчы літара «у» ў краму, купіла сабе абаранак. Адкусіла палавінку, а больш есці не захацела. Так атрымалася «Ў» (у нескладовае). Менавіта так уяўляе гісторыю з'яўлення ўнікальнай літары беларускага алфавіта чацвёртакласнік гомельскай гімназіі № 51 Вячаслаў Ермакоў.**



Ідзе продаж «смачнай літары».

Хлопчык, як і іншыя школьнікі малодшых класаў гэтай установы адукацыі, прыняў удзел у праекце «Згодна з правілам новым пішам у нескладовае». Між іншым, менавіта дзеці падказалі выкладчыкам тэму, якая будзе прадстаўлена на гарадскім фестывалі творчых праектаў. Дарэчы, у мінулыя гады вучні гімназіі № 51 ужо станавіліся пераможцамі: з праектамі пра залежнасць ад мабільнага тэлефона, пра шкоду фаст-фуду і пра стварэнне дзіцячай пляцоўкі. Апошняя прапанова, прынамсі, была адразу рэалізавана ў адным з двароў.

Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Таццяна Кононава гаворыць, што дзеці ў іх творчыя і ўважлівыя: на шыльдах розных устаноў Гомеля заўважылі дастаткова памылак, звязаных з напісаннем «Ў».

— Атрымліваецца, правіла па падручніку яны ведаюць, а ў жыцці сустракаюцца з іншымі прыкладамі. Дзеці прыходзяць з пытаннямі да настаўніка. Вось і прыйшлося ўсім разам праводзіць «работу над памылкамі».




Тут памылка пакуль засталася.

Дарэчы, пачалі са сваёй роднай рускамоўнай гімназіі, шыльду якой таксама пэўны час «упрыгожвала» проста «у» замест патрэбнага «ў». Грошы на новую шыльду сабралі за паўтары гадзіны. На перапынках маленькія грамацеі ператварыліся ў гандляроў і хуценька распрадалі булачкі і печыва ў форме «Ў», якія спяклі іх бабулі. Прыбытак ад правядзення смачнай акцыі (172 тысячы беларускіх рублёў) дзеці перадалі дырэктару гімназіі Аляксандру Пахучаму. А ў арганізацыі, якія «праславіліся» памылкамі на шыльдах, гімназісты накіравалі звароты з просьбай вярнуць «Ў» характэрны для яго «капялюшык». Калегі з рэдакцыі гомельскага штотыднёвіка «Савецкі раён» дапамаглі чацвёртакласнікам аформіць афіцыйныя запыты. Атрымаць адмоўныя адказы са спасылкай на фінансавыя цяжкасці гімназісты не баяцца. Кажуць, што кожны калектыў, які паважае сябе, знойдзе сродкі выправіць памылку на шыльдзе.

А яшчэ вучні здзейснілі віртуальнае вандраванне па Беларусі. Даведаліся, напрыклад, што ў Полацку ўстаноўлены помнік літары «Ў», у сталіцы нашай краіны ёсць галерэя «Ў». Пра ўнікальнасць беларускай літары дзеці напісалі з паўсотні вершаў і гісторый. Лепшыя ўвайшлі ў творчую справаздачу гімназістаў. Сярод іх ёсць і такі шэдэўр ад юнай Ганны Шчарбаковай: «У нескладовае — літара бядовая. Хто яе не ведае, двойкай паабедае».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Дзве даты

## 16 сакавіка

**1506 год** — літоўска-беларускія дружыны разграмілі пад Капылём рэшткі войск крымскіх татараў. Першыя летапісныя звесткі пра горад Капыль з'явіліся ў 1274 годзе. Першым князем, які насіў тытул капыльскага і меў сваю рэзідэнцыю ў горадзе, быў Міхаіл Алелькавіч, пазней горад належаў Радзівілам, Вітгенштэйну. У 1652 годзе ён атрымаў магдэбургскае права і герб — на залатым полі чорны паляўнічы рог. Падчас Айчыннай вайны 1812 года пад Капылём прайшлі баі атамана Платава з ар'ергардам французскай арміі.

**1936 год** — з канвеера Горкаўскага аўтамабільнага завода сышла першая савецкая легкавушка — цягавітая, трывалая і непатрабавальная — народная ўлюбёнка, знакамітая «эмка», апетая Канстанцінам Сіманавым, лімузін маркі «М-1» («М» — азначала Молатаў). «Эмцы» быў наканаваны няпросты лёс: ад «чорнага варанка» НКУС да персанальнага транспарту ўсіх «чырвоных дырэктараў». У якасці падарунка яе атрымалі Стаханаў і яго многія паслядоўнікі. Гэты аўтамабіль стаў увасабленнем савецкага аўтапрама ў 30-х і 40-х гадах. Гэта «на эмке драной и с одним наганом» першымі ўрываліся ў вызваленыя гарады, па словах Канстанціна Сіманава, нашы пераможцы. У 1937 годзе «эмка» ўдзельнічала ў Сусветнай прамысловай выставе ў Парыжы і вельмі годна прадставіла СССР. ГАЗ-М1 выпускаўся на Горкаўскім аўтазаводзе да 1943 года. Усяго ж было выпушчана 62888 такіх аўтамабіляў. Сёння — гэта, вядома ж, музейная рэдкасць. Дарэчы, менавіта «эмка» паслужыла аўтазаводцам базай для канструявання знакамітага аўтамабіля «Победа».



Было сказана:

**Іван МЕЛЕЖ (1921—1976), народны пісьменнік Беларусі:**

***«Жыць з чалавекам, не любячы яго, гэта, я так лічу, усё роўна што нагул не жыць!».***

# ЦЫБУЛЯ-ПАРЭЙ



**У шматлікіх краінах парэй па праве ўваходзіць у лік любімых агароднінных культур. Стравы з парэю прыносяць нашаму здароўю неацэнную карысць. У ім не так многа вітамінаў, затое шмат мінеральных соляў, а таксама эфірных алеяў з утрыманнем серы, якія ўзбуджаюць апетыт, стымулююць работу печані і жоўцевага пузыра. Акрамя таго, парэй — прафілактычны, а часткова і лячэбны сродак пры рэўматызме, падагры і атлусценні. У спалучэнні з іншай гароднінай яго выкарыстоўваюць для прыгатавання салатаў, а тушаны парэй — цудоўны гарнір да мясных страў.**

А вось каб вырасціць прыгожую цыбулю-парэй, трэба ведаць некаторыя сакрэты. Пачынаць давядзецца з расады. Насенне на расаду лепш высяваць у лютым, але можна і ў сакавіку. У нашым клімаце лепш вырошчваць ранні парэй. Увосень і так шмат гародніны. Рыхтуем звычайны вазон. Лепш, калі ён будзе цыліндрычнай формы, а не звужаны да дна. І дыяметр павінен быць не менш за 15 см. Насыпце зямлі не больш чым на 2/3 вышыні вазона. У дне вазона павінна быць адтуліна для сцёку вады. Намачыце зямлю, раскладзіце насенне, засыпце 2 см грунту, накрыйце поліэтыленавым празрыстым пакетам вазон і пастаўце яго ў цёплае месца. Можна і ў цёмнае. Кожныя 2-3 дні трэба здымаць пакет з вазона з пасеянай цыбуляй, злёгку паліваць і зноў закрываць. Пакет патрэбен для падтрымання вільготнасці. Як толькі з'явяцца першыя зялёныя нітачкі, пакет зняць. І паставіць вазон з усходамі на падаконнік, дзе шмат святла. Расада цыбулі-парэю будзе падрастаць. Як толькі на балконе або на верандзе ўсталюецца плюсавая тэмпература, можна выносіць туды вазон з парэем. Толькі трэба закрываць яго ад прамых прамянёў яркага сонца. Асаблівых клопатаў расада парэю не дастаўляе. Па меры падрастання «нітачак» парэю трэба асцярожна падсыпаць грунт. Менавіта таму не варта пры пасеве насыпаць зямлю да верху вазона.

Калі ўсталёўваецца плюсавае надвор'е і не чакаецца замаразкаў, можна высаджваць парэй у грунт. Парэй добра пачуваецца на нейтральных або слабакіслых глебах. Яго трэба вырошчваць у першы год пасля ўнясення гною. Гэта гаворыць пра тое, што парэю патрэбна вельмі тлустая глеба. Як толькі падыдзе час высаджваць парэй, трэба старанна разрыхліць грунт. Потым выкапаць канаўку V-падобнай формы, глыбінёй 15-16 см. На дно пакласці перагной, трохі попелу, усё змяшаць, добра паліць і высаджваць парасткі цыбулі. На першы погляд, страшна падумаць, што іх трэба рассадзіць па адным. Але трэба. Выпростваеце карэньчыкі і акуратна прысыпаеце глебай. Адлегласць паміж раслінкамі — 8—10 см. Атрымліваецца, што цыбуля пасаджана ў траншэю, якая дае ёй прытулак ад халодных вятроў. Зверху трэба накрыць парэй спанбондам да наступлення цёплых дзён. А потым толькі паліваць у выпадку неабходнасці.

А затым, калі яна пойдзе ў рост, хоць гэта здарыцца не адразу, вы будзеце паступова падсыпаць да сцёблікаў грунт са сценак траншэі. Да моманту гатоўнасці цыбулі атрымаецца высокая адбеленая ножка, дзеля якой мы парэй і вырошчваем.



Сардэчна віншуем дарагіх **Вікенція Бернардавіча ПРАЖЭНІКА і Ірыну Бернардаўну РУДЗЯНОК** з в. Старыя Навасёлкі Нясвіжскага р-на з 50-годдзем!

Сёння ў вас — юбілей, цудоўнае свята ў жыцці. З гэтай нагоды прыміце самыя сардэчныя віншаванні і самыя шчырыя пажаданні выдатнага настрою, душэўнага цяпла, шчасця, дабрабыту, доўгіх гадоў жыцця.

***Няхай будзе добрым здароўе,***
***Светлым будзе***
***ваш кожны дзень,***
***Каб з такім жа***
***цудоўным настроем***
***Ваш чарговы сустрэць юбілей.***

**Родныя.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.21 | 19.21 | 12.00 |
| Віцебск — | 7.11 | 19.05 | 11.54 |
| Магілёў — | 7.11 | 19.06 | 11.55 |
| Гомель — | 7.08 | 19.03 | 11.55 |
| Гродна — | 7.37 | 19.31 | 11.54 |
| Брэст — | 7.37 | 19.32 | 11.55 |

**Месяц**
***Апошняя квадра 15 сакавіка. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**
***Пр.** Васіліска, Зінона.*
***К.** Ізабелы, Гіляра, Збігнева, Рэната.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Што гэта ў цябе з тварам?
— Учора хадзіў у трэнажорную залу, хацеў сябе ў форму прывесці...
— Прычым тут трэнажорная зала, я цябе пра твар пытаю!
— Дык у гэтай зале ўчора адзін гіру кульнуў...
— Табе на твар?
— Не. Сабе на нагу.
— А твар?
— А мой твар вырашыў над гэтым пасмяяцца...

**Сябры — гэта тыя, хто ў цябе дома ўжо штосьці ядуць на кухні, а ты яшчэ нават не паспеў распрануцца.**

Жонка — мужу :
— Чаму шкарпэткі па ўсёй кватэры раскіданыя?
— Гэта новая рэкламная акцыя: «Збяры дзесяць пар і атрымай грошы на туш!»



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 1192.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 сакавіка 2012 года.